ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

8 кастрычніка 1931 г.
№ 236 (1503)

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

## З пуцёўкаю правадыра партыі

Краіна, якая будуе сацыялізм, уступіла ў апошні квартал трэцяга, рашаючага году пяцігодкі. У самы адказнейшы квартал, калі закончваецца і будзе ўведзены ў строй рад новых сацыялістычных гігантаў. У квартал рашаючых баёў на завяршэньне фундаменту сацыялістычнай экономікі. І, зразумела, ад пасьпяховага выкананьня задач гэтага кварталу залежыць пасьпяховае выкананьне плянаў заключнага, чацьвёртага году пяцігодкі. А таму мы павінны прыкласьці ўсе сілы, скарыстаць усе сродкі, каб на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва без запазычанасьці ўступіць у заключны, чацьверты год пяцігодкі.

Спаборніцтва прафсаюзных арганізацый Заходняй вобласьці з прафсаюзнымі арганізацыямі Савецкай Беларусі на пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне пляну трэцяга, рашаючага, году пяцігодкі, на хутчэйшае і як мага лепшае ажыцьцяўленьне праграмы гістарычнай прамовы тав. Сталіна, зьяўляецца вялікім вагаром у гэтай справе.

Задача ленінскага комсамолу—падтрымаць гэтае каштоўнейшае пачынаньне. Па прыкладу віцебскай комсамолі зараз-жа разгарнуць работу па мобілізацыі ўвагі працоўных мас, комсамольскіх арганізацый на рэалізацыю ўсіх мерапрыемстваў, згодна сказанай умовы.

Зьмешчаныя сёньня ў нашай газэце маршруты „комсамольскай сталінскай пуцёўкі чацьвёртага заключнага"—зьяўляюцца конкрэтнай разгорнутай праграмай дзейнасьці для кожнай комсамольскай арганізацыі, конкрэтнай справай барацьбы кожнага комсамольца за выкананьне вялікага пляну сацыялістычнага будаўніцтва—пяцігодкі ў чатыры гады.

Ад таго, які мы зараз дамо ход „комсамольскай сталінскай пуцёўцы чацьвёртага заключнага", як арганізуем вакол яе работу па мобілізацыі ўвагі комсамольцаў, рабочай працоўнай моладзі, залежаць безумоўна, і вынікі нашай работы.

Кожны комсамольскі камітэт, колектыў, ячэйка, брыгада, цэх павінны зараз-жа абгаварыць гэты наказ-пуцёўку чацьвёртага заключнага і безадкладна прыступіць да яе рэалізацыі.

Кожны комсамолец павінен рыхтавацца да атрыманьня ў рукі гэтай пуцёўкі. І, атрымаўшы яе, прыкласьці ўсе намаганьні, каб выканаць маршруты, зьвязаныя з яго работай.

Практычная работа, вынікі, асабліва ў гэтай справе павінны стаць для кожнага комсамольца, для кожнай арганізацыі мерылам іх здольнасьцяў, уменьня працаваць па-новаму ў новых умовах, на баявому змаганьні за выкананьне бальшавіцкага пляну.

З „комсамольскай сталінскай пуцёўкай чацьвёртага заключнага" мы абавязаны па-сталінску па-бальшавіцку, раўняючыся па перадавых (хто ўжо выканаў і перавыканаў пляны пяцігодкі), змагацца за бесьперабойную работу прадпрыемстваў, за выкананьне шасьці задач, пастаўленых правадыром партыі Сталіным, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, за выкананьне плянаў нарыхтовак, уборкі, зяблівага ворыва, за паляпшэньне культурна-бытавых умоў рабочых, саўгасьнікаў, колгасьнікаў, за ператварэньне комсамолу ў шматмільённую арганізацыю.

Да пленуму ЦК КП(б)Б

Выязная брыгада ЦК ЛКСМБ, „Чырвонай Зьмены", „Юнгэр Арбэтэр" і радыё-газэты „Комсамолец Беларусі" — у Воршы

# Ударным патокам асеньня-зімовых— рапартаваць бальшавіцкаму штабу

### Адрамантаванымі паравозамі, поўным выкананьнем вымернікаў сустрэнем пленум ЦК КП(б)Б

Аршанскі вузел разгарнуў вялікую падрыхтоўку да пленуму

## У падарунак пленуму адрамантуем паравоз

### Конкрэтныя абавязкі колектыву ЛКСМБ цягі Аршанскага вузла па падрыхтоўцы да кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б

Прызнаючы, што поўнае выкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак і пляну 4-га кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі мае асаблівае значэньне,—колектыў комсамолу цягі бярэ на сябе наступныя абавязкі.

1. Ахапіць поўнасьцю фактычным соцспаборніцтвам усю рабочую моладзь (у дэпо зараз працуе 180 чал. рабочай моладзі, з іх 161 комсамолец, ударнікаў 142 чал.).

2. Організаваць тры ўдарныя камсамольскія брыгады (2 на выпадковым рамонце паравозаў і 1 на абточцы).

3. Перавесьці на гаспадарчы разрахунак комсамольскую брыгаду абточкі, організаваўшы дзеля гэтага плянава-опэрацыйную групу.

4. Адрамантаваць звыш пляну ў падарунак кастрычнікаваму пленуму ЦК КП(б)Б паравоз, выпусьціўшы яго з рамонту прамыўкі.

5. Падагуліць вынікі працы гаспадарча-разрахунковых комсамольскіх брыгад і паравознай брыгады сэрыі „Ш" 323, распаўсюдзіўшы іх вопыт.

6. Ахапіць усіх комсамольцаў парт тэхвучобай, дзеля чаго ўвесьці 8-ую гадзіну тэхвучобы ў комсамольскія маладзёжныя брыгады.

Кацельшчык Ладышын правёў ударную работу па вальцоўцы труб, чым скараціў прастой паравозаў у рамонце на 10 гадзін.

7. Організаваць у кожнай брыгадзе штодзённую газэту „За работу па новаму" склаўшы юнкораўскі актыў. Выпусьціць штодзённу акрамя брыгад і на паравозах сэрыі „Ш" 323 і „ОВ" 6153.

8. Уцягнуць у рады КСМ яшчэ неахопленых комсамолам 19 чал.

9. У час падрыхтоўкі да пленуму сабраць 50 рацыяналізатарскіх прапаноў і прасачыць за іх рэалізацыяй.

10. Ліквідаваць паўторнасьць рамонту, асабліва інвэнтара на паравозах ОВ, склаўшы дзеля гэтага комсамольскую брыгаду з т. т. Барушка, Яськевіча, Талакко, Вераб'ёва і Юшкевіча!

11. Для ўстанаўленьня кантролю за выкананьнем абавязкаў, узятых па падрыхтоўцы да кастрычнікавага пленуму ЦК КП(б)Б, скласьці брыгаду з наступных таварышоў: Талан, Галкоўскі, Юшкевіч, Маневіч, Талако, Барушка, Арнатаў, Стахоўскі, Санчыла, Рыбакоў, Маеўскі, якой даручыць штодзённа асьвятляць у друку стан падрыхтоўкі.

## З адозвы

### Да ўсіх чыгуначных, партыйных, профсаюзных і комсамольскіх організацый БССР у сувязі з падрыхтоўкай да кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б

У выніку выкананьня задач, пастаўленых партыяй і урадам перад транспортам, Аршанскі чыгуначны вузел мае наступныя паказчыкі за верасень месяц:

а) Спараная язда замацавана на 91,1 проц. б) Процант хворых паравозаў: задана 12,8-выканана на 14,1 проц. в) Адпраўленьне цягнікоў па раскладу—на 96 8 проц.

Коэфіцыэнт манэўровай работы—на 108,7 проц. д) Прастой вагонаў на грузавых опэрацыях—на 12, па транзітах—на 113 проц. е) Спэцыялізацыя цягнікоў выканана на 94,5 проц, ж) Маршрутызацыя цягнікоў выканана на 71 проц. з) Прабег кандуктарскіх брыгад выканан: па пасажырскім руху, на 100 проц., па таварным на 99 проц, па гаспадарчым—на 100 проц

і) Норма выпрацоўкі па тавара-станцыйных работах выканана на 105,1 проц.

к) Сярэдні сутачны прабег пасажырскіх паравозаў: задана 2?5 клм,—выканана 312,4 проц. клм.

Аднак, тэмпы работы вузла не забясьпечваюць поўнасьцю баявое выкананьне задач, пастаўленых партыяй і урадам па радзе паказчыкаў транфінпляну (ня выконваецца сьледваньне цягнікоў па раскладу, процант хворых паравозаў не даведзены да заданай нормы, ня выконваецца сярэдні сутачны прабег таварных паравозаў, спэцыялізацыя і маршрутызацыя цягнікоў і г. д.).

З прычыны паслабленьня ўвагі гаспадарчых, партыйных і профсаюзных організацый мы маем значныя зрывы спаранай язды, што сьведчыць аб адсутнасьці бальшавіцкай барацьбы з абязьлічкай на паравозах.

Зараз транспорт уступіў у пэрыод асеньня-зімовых перавозак, што патрабуе напружанай работы, высокіх тэмпаў у выкананьні колькасных якасных паказчыкаў транфінпляну чацьвертага, рашаючага кварталу трэцяга году пяцігодкі. Усе прарывы павінны быць безадкладна зьнішчаны.

Мы прымаем выклік Гомельскага вузла абвясьціць кастрычнік ўдарным месяцам ліквідацыі прарыву ў рабоце чыгуначнага транспорту і ўключаемся ў правядзеньне ўдарнага месячніку.

Дні, якія засталіся да сьвята XIV-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі і пленуму ЦК КПбБ, павінны стаць днямі ўдарнай работы і бальшавіцкіх тэмпаў на ўсіх вучастках транспорту.

К пленуму ЦК КПбБ чыгуначнікі павінны рапартаваць аб сваіх посьпехах у барацьбе за транфінплян.

У парадку падрыхтоўкі да кастрычнікавага пленуму ЦК КПбБ і XIV-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі мы бярэм на сябе наступныя абавязкі па забясьпечаньню нормальнага ходу асеньня-зімовых перавозак:

1. Поўнасьцю ліквідаваць зрывы ў спаранай язьдзе;
2. Дабіцца 100 проц. сьледваньня цягнікоў па раскладу;
3. На 100 проц. правесьці маршрутызацыю і спэцыялізацыю перавозак;
4. Павялічыць сярэдня-сутачную работу паравоза і вагона (у руху) мінімум на адну гадзіну;
5. Зьнізіць нормы прастою вагонаў па грузавых і транзітных опэрацыях на 5 проц;
6. Зьнізіць процант хворых паравозаў ніжэй заданьня на 1 проц;
7. Павялічыць коэфіцыэнт манэўровай работы ня менш, як на дзьве гадзіны звыш заданай нормы;
8. Поўнасьцю ліквідаваць здарэньні, а таксама порчу паравозаў і вагонаў у дарозе;
9. Прывесьці ў поўную спраўнасьць станцыйныя шляхі і стрэлкі;
10. Закончыць пабудову больніцы, дому брыгад на Ворша-Усходняя, 2-павярховага жыльлёвага дому ад цэнтралізаваных стрэлак;
11. У асноўным перавесьці на гаспадарчы разрахунак усе падсобныя цэхі, брыгады і паравозы;
12. Канчаткова ліквідаваць абязьлічку ў рамонце вагонаў і тэхнічным аглядзе іх. Адначасова зьвяртаемся да дырэкцыі дарогі хутчэй вырашыць пытаньне аб поўнай ліквідацыі абязьлічкі ў вагонным парку,
13. К пленуму ЦК КПбБ скончыць перавод на зьдзельную аплату працы ўсе асноўныя галіны вытворчасьці і падсобныя цэхі;
14. На 100 проц. ахапіць ударніцтвам комуністых, комсамольцаў і ўсіх рабочых вузла. Організаваць новыя ўдарныя брыгады „імя XIV-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі";
15. Поўнасьцю ахапіць партыйна-тэхнічнай вучобай комуністых, комсамольцаў і ўсіх рабочых;
16. Організаваць у кожным цэху, брыгадзе штодзенныя газэты „За работу па-новаму" і забясьпечыць кіраўніцтва і практычную дапамогу з боку партыйнай і профсаюзнай організацый;
17. Поўнасьцю перабудаваць работу коопэрацыі ў адпаведнасьці з рашэньнямі ЦК УсеКПб і КПбБ. Правесьці сходы па ўсіх цэхах, брыгадах, з тою мэтай, каб кожная група ўзяла конкрэтныя абавязацельствы на час ударнага месячніку.

Мы зьвяртаемся да ўсіх чыгуначных, партыйных, профсаюзных, комсамольскіх організацый БССР з заклікам зараз-жа ўключыцца ў правядзеньне ўдарнага месячніку. Мы запэўніваем ЦК КПбБ, што на аснове разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва, перабудовы ўсёй сыстэмы партыйнай, профсаюзнай і комсамольскай работы—выканаем узятыя на сябе абавязкі да пленуму ЦК КПбБ.

Па даручэньню парт'актыву—трыкутнік раёну Кофман, Злотнікаў і Васільеў.

## Як вы сустрэлі восень?

17 кастрычніка а 20-й гадзіне 10 хвілін слухайце радыё-пераклічку на пытаньнях падрыхтоўкі комсамолу транспорту да асеньня-зімовых перавозак.

У мікрафона ЦК ЛКСМБ, Ворша, Гомель і Віцебск.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены"
Рэдакцыя Радыё-газэты „Комсамолец Беларусі".

# КРЫВАВАЙ ДЫКТАТУРАЙ ФАШЫСТАМ НЕ ЎТРЫМАЦЬ СВАЁ ПАНАВАНЬНЕ

## Расьце хваля нездавальненьня працоўных мас

### Хваля протэсту супроць катаваньняў польскага фашызму над палітзьняволенымі

Мы, колгасьнікі „Авангарду", протэстуем супроць нячуваных зьверскіх учынкаў катаў польскага фашызму над палітзьняволеным.

У адказ на гэтыя зьдзекі, уносім 44 рублі на карысьць палітвязьняў і ўступаем, усе як адзін, у рады МОПР'у. Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу іншыя колгасы.

* Мы студэнты другога курсу Менскага Хэміка-Тэхнолёгічнага Тэхнікуму, выносім свой рэзкі протэст супроць зьверскіх катаваньняў над польскімі палітзьняволенымі.

У адказ на гэта ўносім на карысьць польскіх палітвязьняў 54 рублі і ўступаем, усе як адзін, у рады МОПР'у. Выклікаем усё працоўнае студэнцтва пасьледваць нашаму прыкладу.

### Кваліфікаваны налёт „невядомых"

ВАРШАВА 4. (ТАСС) Як паведамляе пэпээсаўскі „Работнік" у Льве „невядомыя" разграмілі памяшканьне рэдакцыі органа Ундо (Украінскае народнае дэмократычнае аб'яднаньне), „Дзіло" і памяшканьне ўкраінскай буржуазнай асьветнай організацыі „Просьвіта". У памяшканьні „Дзіло" разьбіты ўсе шкафы і сталы.

Рэдакцыя „Дзіло" адзначае, што налёт мае палітычны характар, аб чым сьведчыць „кваліфікаваная работа" налётчыкаў.

### У кіпцюрох крызісу

Польскі дзяржаўны банк апублікаваў пэсымістычную справаздачу аб гаспадарчым становішчы Польшчы ў жніўні бягучага году.

Справаздача констатуе, што ўраджай хлеба ў гэтым годзе значна ніжэйшы, чым леташні. Ураджай пшаніцы зьнізіўся на 12 проц. жыта—на 26 проц.

Ня гледзячы на гэта, цэны не павышаюцца, бо няма попыту.

Таксама значна зьнізіўся экспорт жывёлы—на 30 проц.

У сувязі са зьніжэньнем зарплаты рабочым і служачым, значна скараціліся гандлёвыя звароты, што выклікала зьніжэньне вытворчасьці па ўсіх галінах прамысловасьці.

Пагоршылася становішча нафтавай прамысловасьці ў сувязі з затрымкай экспорту нафтапродуктаў, зьменшылася выплаўка чыгуна на 12 проц., вытворчасьць сталі—на 8 проц Пагоршаньне назіраецца таксама ў тэкстыльнай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці.

Астатнія галіны, як гарбарная, сілікатная, керамічная, машына-будаўнічая і інш., па-даўнейшаму знаходзяцца ў цяжкім стане крызісу. Справаздача паказвае, што экономічнае становішча Польшчы ўсё больш і больш пагаршаецца ў сувязі з захапіўшым яе крызісам.

(„Кр. ЗВ")

### Пан Кенэ „ратуе" сьвет ад крызісу

„Генэральны дырэктар Банку міжнародных разрахункаў у Базэлі-француз Кенэ—выпрацаваў проэкт скарачаньня ўсеагульнага залатога пакрыцьця грашовых зваротаў".

(З газэт)

# СА СТАЛІНСКАЙ ПУЦЕЎКАЙ

# ПУЦЕЎКА УРУЧАНА! ПРЫСЬЦІ У ЧАЦЬВЕРТЫ

## і апошні год пяцігодкі саўгасна-колгаснага будаўніцтва з бальшавіцкай перамогай

**У БОЙ ЗА** арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў і саўгасаў, новы колгасны прыліў, соцмэтады працы, высокую таварную жывёлагадоўлю і ўраджай, соцыялістычныя кадры і новы быт.

**Маршрут I**

## Мацаваць цытадэль соцвытворчасьці

У 1932-33 годзе скончыць у асноўным суцэльную колектывізацыю БССР і на яе аснове ліквідаваць кулацтва, як клясу.

Галоўная задача кожнага комсамольца на даным этапе колгаснага будаўніцтва—гэта арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў. Ты павінен энэргічна працаваць над пляваньнем колгаснай вытворчасьці, складаньнем пляну 1932 году, організаваць плянава-опэрацыйныя групы-брыгады і сустрэчны плян. Правільна арганізаваць працу колгасу організаваць брыгадную сыстэму працы, ахапіць соцспаборніцтвам, ударніцтвам усіх колгасьнікаў, укараніць зьдзельшчыну і ўлік па працаднёх колькасьці і якасьці працы колгасьніка. Ліквідаваць абязьлічку і ўраўнілаўку ў сваёй брыгадзе. Дабіць кулацкую політыку ўраўнілаўкі пры разьмеркаваньні прыбытку. К вызначанаму тэрміну прыбыткі колгасу павінны быць разьмеркаваны на аснове ўліку працаднёў.

Перавесьці ўсю працу ў саўгасе на прогрэсыўна-преміяльна-зьдзельную аплату. Перавесьці брыгады на гаспадарчы разрахунак.

Організаваць гурткі па падрыхтоўцы кадраў, брыгадзіраў, жывёлаводаў, рахунковых працаўнікоў і інш.

Дабіцца, каб колгас выканаў пляны загатовак (здаў дзяржаве таварныя лішкі) і плян мобілізацыі сродкаў у строга вызначаны тэрмін.

**Маршрут II**

## Абновім ураджай абноўленай зямлі

Каб выканаць гэты маршрут—трэба ўзьняць таварнасьць соцыялістычнай гаспадаркі—заваяваць высокі ўстойлівы ўраджай.

Ты павінен быць ініцыятарам арганізацыі брыгад маладых вопытнікаў-рацыяналізатараў і вынаходцаў. Аўладаць тэхнікай працэсаў с-г вытворчасьці і агротэхнікай. Выявіць, якая ў галіне і культуры сельскай гаспадаркі колгасу, саўгасу зьяўляецца вядучай, высокатаварнай і змагацца за яе прысьпешнае разьвіцьцё. Аўладаць агротэхні-



кай іх вырабу, тэхнікай сельскагаспадарчых машын (трактар, і інш. с-г. машыны). На 100 проц. выканаць плян зяблевага ворыва, змагацца з засухай.

**Маршрут III**

## Аўладаць вагарамі мясной проблемы

Проблема жывёлагадоўлі—галоўная проблема дня.

Па гэтым маршруце неабходна: за абвешчаны ЦК КП(б)Б двухмесячнік штурму ліквідаваць прарыў у будаўніцтве сьвінарнікаў і комплектаваньні гурту сьвіней і буйнай рагатай жывёлы. Правесьці ацяпленьне сьвінарнікаў і кароўнікаў, дабіцца, каб саўгасы, колгасы і фэрмы вырабілі апарос—тону, уключыцца ва ўсесаюзнае спаборніцтва за тону апарос. Правесьці ў жыцьцё самае дэталёвае і глыбокае вывучэньне тэхнікі групавога ўтрыманьня сьвіней. Выкарыстаць гар-



бэдж і вывучыць практыку арганізацыі гэтай справы. Укараніць на фэрмах і саўгасах мэханізацыю кармленьня сьвіней, самакармушкі і самапаілкі. Забясьпечыць супаросных, падсосных матак і маладняк вітамінным кармамі. Дабіцца 100 проц. злучкі матак. Поўнасьцю захаваць маладняк.

## Сэкратарыят ЦК

1. Абавязаць усе комсамольскія організацыі разгарнуць шырокую масавую работу па рэалізацыі соц. умовы ЦСПСБ з нах. обласьцю. У чарговы комсамольскі дзень шырока прапрацаваць і намеціць практычныя дзеяньні комсамольскіх і проф. організацый у галіне рэалізацыі соц. умовы мобілізуючы ўвагу ўсіх комсамольцаў і ўсёй рабочай моладзі на бязумоўнае выкананьне прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі на бальшавіцкую падрыхтоўку да 4-га заключнага году, на сацраўднае укараненьне ў жыцьцё прадпрыемства ўказаньняў тав. Сталіна. Дзеля гэтага яшчэ шырэй разгарнуць соц. формы адносін да працы, організацыю соц. гас- разрахунковых брыгад, ўкараненьне ва ўсіх прадпрыемствах ў масавым маштабе зьменна-сустрэчных пляна ў. Сіламі комсамольскай організацыі да 23-Х-1931 г. організаваць ня менш 300 гаспадарда-разрахунковых брыгад імя 4-га заключнага. З 1-га па 7-е лістапада абвясьціць ўсебеларускую комсамольскую сямідзёнку масавай праверкі стану соцспаборніцтва і ўдарніцтва на прадпрыемствах, у саўгасах і колгасах.

2. ЦК ЛКСМБ адзначае, што рашаючай задачай у падрыхтоўцы народнагаспадарчага пляну на 1932 г. зьяўляецца: мобілізацыя ўвагі рабочых мас і ўсёй савецкай грамадзкасьці на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну 4-га кварт. 1931 г. і асабліва ў галіне якасных паказчыкаў.

Комсамольская організацыя павінна сконцэнтраваць сваю ўвагу на:

а) падвышэньне вытворчасьці працы, лепшай організацыі рабочай сілы на аснове правільнай расстаноўкі па брыгадах, зьменах і агрэгатах, барацьбе з ураўнілаўкаю, устанаўленьні норм і палепшаньні тэхнічнага нормаваньня:

б) паменшаньне норм выдатку матар'ялаў, сыравіны, паўфабрыкатаў, паліва, энэргіі, замене дэфіцытнага матар'яла менш дэфіцытным:

в) правільнай расстаноўцы абсталяваньня, ліквідацыі абязьлічкі, устанаўленьн пашпартызацыі, зьнішчэньні страт у скарыстаньні абсталяваньня;

г) зьніжэньні накладных выдаткаў, ліквідацыі браку, зьмяншэньне страт і адыходаў вытворчасьці;

д) палепшаньні матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых, мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў і палепшаньні аховы працы.

3. Каб забясьпечыць сыстэматычны ўдзел рабочых у пляніваньні вытворчасьці і паглыбленьні прапрацоўкі якасных паказчыкаў, комсамольскім ячэйкам узяць ініцыятыву па організацыі на кожным прадпрыестве, у саўгасе і колгасе да 20-Х—1931 г. агульных цэхавых і зьменных сталых плянава-опэрацыйных груп, устанавіўшы сталы кантроль за пастаноўкай іх работы.

**Маршрут IУ**

## Заваяваць высокі, устойлівы ўраджай тэхкультур

Правесьці апрабаваньне насеньня лёну і канапель у колгасе, організаваць заказьнік насеньня лёну і канапель. Аўладаць тэхнікай апрацоўкі глебы пад лён, сяўбы догляду за пасевам лёну, цераблень-ня, мочкі, расьсцілу і першапачатковай апрацоўкі. Выканаць к тэрміну плян здачы ільнавалакна. Дасьледаваць, якія гатункі лёну на ўмовах раёну даюць лепшы ўраджай, тэрмін іх сяўбы, падрыхтоўку глебы і час уборкі.

К тэрміну скончыць будаўніцтва падшэфных комсамолу 45 ільназаводаў.

**Маршрут У**

## Працаваць і жыць па-новаму

К 1932 году БССР павінна стаць краінай суцэльнай пісьменнасьці.

Абавязковая ўмова гэтага маршруту—ліквідацыя няпісьменнасьці і паслядоўнае правядзеньне ўсеагульнага навучаньня, організацыя культурнага адпачынку рабочых саўгасаў, колгасьніка, прасоўваньне агротэхнічнай, мастацкай літаратуры і газэт у шырокія колы колгасьнікаў, організацыя дзіцячых ясьляў, грамадзкіх сталовак, пральняў і ўкараненьне радыё.

### У новых умовах працаваць па-новаму

Ты павінен дабіцца, каб, у адпаведнасьці з высунутымі ў першых маршрутах пытаньнямі, перабудаваць усю работу колектыву, ячэйкі: у цэху, брыгадзе, зьмене, саўгасе, колгасе і МТС.

Разам з барацьбой за выкананьне прамфінпляну, чарговых гаспадарча-політычных задач колгасамі, саўгасамі, ты павінен дамагацца, каб марксысцка-ленінскае выхаваньне комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі было пастаўлена на належную вышыню. Ты павінен сам вучыцца і ўцягнуць у політсетку тваіх таварышоў, змагацца за якасьць вучобы.

Барацьба за шматмільённы комсамол—не самамэта а сродак для павялічэньня ўдзелу комсамольцаў і працоўнае моладзі ў разгорнутым соцыялістычным будаўніцтве. Праз індывідуальную апрацоўку змагайся за 100 проц. уцягненьне рабочай моладзі ў комсамол, за організацыю пры кожным колгасе, саўгасе і МТС комсамольскай ячэйкі. Асаблівую ўвагу аддаць замацаваньню навічкоў, уцягваючы іх у грамадзка-вытворчае жыцьцё прадпрыемства.

Ваенізацыя комсамолу—неадрыўная частка работы комсамольскай ячэйкі. Ты павінен дабіцца, каб кожны комсамолец, беспартыйная працоўная моладзь наведвалі вайсковы пункт, добра ведалі вайсковую справу.

Адна з галоўных задач комсамольскай організацыі—ахоп усіх рабочых асабліва моладзі профсаюзам. Ты абавязан уцягнуць усіх удзельнікаў тваёй брыгады ў члены профсаюзу. Памятай, што профсаюзы—школа комунізму.

## Уключайцеся ў паход за організаваную сустрэчу зімы

Комсамольская організацыя вёскі „Алешына" Пушкінскага раёну Маскоўскай обласьці выступіла праз „Комсамольскую Праўду" у паход за організаваную сустрэчу зімы.

Асноўнымі лёзунгамі зімоўкі „алешынцы" высунулі:

— Акомсамоліць ударныя вучасткі.

— Ніводнай галавы адыходу, асабліва маладняка.

— Даць дзяржаве максімум таварнай продукцыі.

„Чырвоная Зьмена" падхоплівае пачын „алешынцаў" і ўключаецца ў барацьбу за організаваную сустрэчу зімы. „Чырвоная Зьмена" заклікае ўсю комсамольскую організацыю Беларусі разгарнуць шырокую работу, каб хутчэй рэалізаваць гэта пачынаньне, прасягнуць і падпарадкаваць усю сваю практычную работу організаванай сустрэчы зімы і падрыхтоўцы сьвінарнікаў і кароўнікаў да зімовага пэрыяду.

Комсамольскія організацыі, асабліва жывёлагадоўчых раёнаў, колгасаў і саўгасаў сустрэньце „Дзень ураджаю і колектывізацыі" ўсебеларускім паходам. За зусім гатовыя і прыгодныя для зімовага ўтрыманьня жывёлы сьвінарнікі і аборы.

# АДЧЫНІЦЕ СЭМАФОРЫ!

## Комсамол Магілеўскай чыгункі зрывае перавозку бульбы

### Загатоўкам—бальша віцкія тэмпы

У Горбаўскім сельсавеце Лёзьненскага раёну ва ўсю шыр разгарнулася кампанія па загатоўкам хлеба і бульбы. Сельсаветам выпрацаваны пляны загатовак і давесены да паасобных колгасаў і вёсак.

Па ўсіх колгасах сельсавету пачалі капаць бульбу з 20 верасьня. Організаваны спэцыяльныя брыгады капальшчыц з жанчын.

Комсамольскія ячэйкі сельсавету пытаньні загатоўкі бульбы і хлеба абгаварылі на сваіх сходах, вызначылі конкрэтныя мерапрыемствы, каб хутчэй скончыць работу і здаць продукт дзяржаве.

Колгас „Перадавік" бульбу ўжо выбраў. Комсамольцы мобілізаваны зараз на хатні абход аднаасобнікаў і організацыю чырвоных абозаў.

Вакол загатовак бульбы і хлеба шырока разгорнута клясавая барацьба, але колгасьнікі і бядняцка-серадняцкая частка вёскі даюць рашучы адпор клясава-варожым вылазкам і мобілізоўваюць усе сілы на датэрміновае выкананьне кантрольных заданьняў па загатоўках.

М. Гузоўскі

### Чыгуначны вузел не падрыхтаваўся

#### Адпраўка зрываецца

Магілеў 7-УІІІ. (маланка)—Менск, рэдакцыя „Чырвонай зьмены".

Адпраўка 2-х комсамольскіх эшалёнаў бульбы Ленінграду зрываецца.

Комсамол чыгункі да асеньня-зімовых перавозак не падрыхтаваны. Праходзяць тэрміны адпраўкі. Просім садзейнічаньня.

Райкамол Шалькевіч.

### Тры эшалёны бульбы Ленінграду ад Аршанскай комсамоліі

*(Па тэлефону ад нашага спэцкора)*

ВОРША, 7. У адказ на выклік Ленінградзкай комсамольскай організацыі — Аршанская комсамолія накіроўвае 3 эшалёны бульбы для працоўных Ленінграду.

Чыгуначная комсамольская організацыя абавязалася даставіць гэтыя эшалёны ў Ленінград.

ФІЯЛКІН

### Не адгрузілі ніводнага кілё

Барысаў. Тэмпы, якімі разгортваюцца загатоўкі і адгрузка бульбы для Ленінграда ў Барысаўскім раёне пагражаюць зрывам пляну. Да сёньняшняга дня ні райза, ні райкоопсаюз з вызначаных 854 тон бульбы яшчэ не адгрузілі ніводнага кілёграма. Райза нават ня ведае ў які адрас адгружаць, бо ня мае яшчэ нарадаў.

Бедта.

# НА ШТУРМ УДАРНЫХ ДЗЕН

## Сталінская пуцёўка-маршрут кожнага комсамольца ў барацьбе за ўзьняцьце соцспаборніцтва на вышэйшую ступень, за пасьпяховае сканчэньне плянаў трэцяга рашаючага — за ўзброеную сустрэчу апошняга заключнага году пяцігодкі

### ЛКСМБ пастанавіў:

4. З 15-га па 20-е кастрычніка г. г. правесьці ўсебеларускую комсамольскую пяцідзёнку для праверкі работы комсамольскай організацыі па рэалізацыі прамовы тав. Сталіна. Організаваць усебеларускі збор прапаноў у фонд 4-га году пяцігодкі. Каб рэалізаваць прамову тав. Сталіна і па-бальшавіцку падрыхтавацца да 4-га заключнага, выпусьціць «Комсамольскую сталінскую пуцёўку 4-га заключнага». Разгарнуць шырокую масавую работу вакол задач 4-га году пяцігодкі ў клюбах, чырв. кутках, па цэхах, брыгадах, у фабрычна-завадзкім і агульным друку, забясьпечыўшы актыўны ўдзел комсамольцаў і рабочае моладзі ў прапрацоўцы сустрэчнага, 4-га году пяцігодкі.

5. Усім камітэтам комсамолу ўзяць пад свой непасрэдны кантроль своечасовае сканчэньне і поўнае выкананьне кантрольных лічбаў асеньняга набору ФЗВ. Забясьпечыць максімальны ўдзел комсамольскай організацыі ў складаньні пляну кадраў на 1932 г., прыняўшы ўсе захады к таму, каб тэмпы разьвіцьця фабрычна-заводзкага вучнёўства ў БССР былі ўзяты ў адпаведнасьці з рашэньнямі XVI-га партзьезду аб ахопе да канца пяцігодкі праз асноўную форму падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў—ФЗВ—60 проц. Узмацніць работу комсамольскіх організацый па рэалізацыі пастановы ЦВК і СНК СССР аб уцягненьні ў прамысловасьць адыходнікаў, колгасьнікаў і аднаасобнікаў. Ажыцьцявіць пастанову зьезду комсамолу аб інтэрнацыяналізацыі складу школ ФЗВ.

6. У першай палове кастрычніка правесьці ўсебеларускі налёт груп лёгкай кавалерыі з мэтай праверкі правільнага і поўнага скарыстаньня абсталяваньня, рэалізацыі пляну мэханізацыі бягучага году.

7. З 20-га кастрычніка правесьці ўсебеларускі радыё-сход комсамольцаў па пытаньню рэалізацыі соц. умовы і задач комсамолу ў 4-м годзе пяцігодкі.

8. Організаваць на старонках комсамольскага друку пераклічку маладых савецкіх спэцыялістых па пытаньню лепшай пастаноўкі работы, аўладаньня тэхнікай і падрыхтоўкі да 4-га заключнага.

9. Аказаць належную практычную дапамогу профсаюзным організацыям у канчатковай перабудове да 1-га студзеня 1932 г. работы вытворчых нарад па ўсіх прадпрыемствах адпаведна з рашэньнямі У-га Пленуму ЦСПСБ.

Організаваць пры кожнай комсамольскай ячэйцы вытворчай нарадзе комсамольскія маладзёжныя вытворчыя сэкцыі, задачамі якіх паставіць прапрацоўку вытворчых пытаньняў, унясеньне колектыўнай маладзёжнай думкі на вытворчых нарадах, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на пастаноўку работы вытворчых нарад вядучых профэсій.

10. Усім організацыям комсамолу забясьпечыць актыўны ўдзел у барацьбе за поўны ахоп профсаюзамі ўсіх рабочых, якія адпавядаюць запатрабаваньням саюзнага статуту.

### Маршрут I

## Дагавор з Заходняй вобласьцю

У мэтах бязумоўнага выкананьня прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі і забясьпечаньня выкананьня чацьвертага заключнага году пяцігодкі, Заходні Абласны Савет Профсаюзаў ад імя ўсіх профорганізацый Заходняй Обласьці і Цэнтральны Савет Профсаюзаў БССР ад імя ўсіх профсаюзаў БССР складаюць паміж сабою дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва,

Ты павінен прапрацаваць увесь дагавор, складзены паміж Аблпрофсаветам Заходняй обласьці і ЦСПСБ, ведаць дагавор сваёй саюзнай організацыі і прыняць актыўны ўдзел у складаньні соцдагавору паміж тваім прадпрыемствам і адпаведным яму прадпрыемствам Заходняй обласьці.

Рэалізуючы ў тэрмін конкрэтныя заданьні даныя табе ячэйкай па гэтым маршруце ты зьявішся непасрэдным удзельнікам выкананьня гэтага дагавору.

### Маршрут II

## За ўнутрыпрамысловае накапленьне

„Выходзіць нарэшце, што нельга па-ранейшаму абыходзіцца на старых крыніцах накапленьня. Каб забясьпечыць далейшае разгортваньне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, трэба дабіцца таго, каб пусьціць у ход новыя крыніцы накапленьня, ліквідаваць безгаспадарчасьць, укараніць гаспадарчы разрахунак, зьнізіць сабекошт і падняць унутрыпрамысловае накапленьне“. (Сталін).

Ты павінен стаць застрэльшчыкам у пераводзе твайго цэху на гаспадарчы разрахунак, у сапраўдным кантролі рублём. Рэалізаваць пастанову ЦК ЛКСМБ аб пераводзе тваёй брыгады на гаспадарчы разрахунак, дапамагчы рахунковаму апарату свайго прадпрыемства падрыхтаваць конкрэтныя лічбы для тваёй брыгады, цэху.

Уносячы і выконваючы рацыяналізатарскія прапановы, ты прымеш актыўны ўдзел у зьніжэньні сабекошту.

Выкананьне другога маршруту дасьць магчымасьць твайму прадпрыемству ўзброіцца для сустрэчы апошняга году пяцігодкі.

### Маршрут III

## „Тэхніка ў пэрыод рэконструкцыі вырашае ўсё“

„Нам засталося няшмога: вывучаць тэхніку, аўладаць навукай. І калі мы зробім гэта, тады ў нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы ня сьмеем і марыць“. (Сталін)

Ты павінен прапрацаваць пастанову ЦК УсеКП(б) („Праўда“, 8 жніўня 1931 г.) аб організацыі ўсеагульнага тэхнічнага навучаньня, праз максімальнае скарыстаньне 8-ай гадзіны. Стаць ініцыятарам гэтага мерапрыемства і прыцягнуць да тэхнічнага навучаньня ўсю сваю брыгаду.

Надзвычай востра стаіць пытаньне аб тэхнічнай пісьменнасьці новай рабочай сілы, якая ўліваецца ў прадпрыемствы.

Сумесна з адміністрацыяй і проф організацыяй свайго цэху, організуй тэхнічны карантын (прачытай аб гэтым у „Чырвонай Зьмене“ ад 12 верасьня), будзь застрэльшчыкам організацыі курсаў па аўладаньні тэхнікай.

### Маршрут IV

## „За зарплату па-новаму супроць абязьлічкі“

„...Нельга далей цярпець цякучасьць рабочай сілы ў прамысловасьці. Трэба організаваць зарплату па-новаму. Нельга больш цярпець абязьлічку. Трэба па-новаму організаваць працу, трэба расставіць сілы такім чынам, каб кожная група рабочых адказвала за работу, за мэханізмы, за варштаты, за якасьць работы“. (Сталін).

Ліквідацыя ўраўнілаўкі, увядзеньне простай і прэміяльна прогрэсыўнай зьдзельшчыны—конкрэтны шлях зьнішчэньня цякучасьці рабочай сілы.

Ты павінен стаць актыўным удзельнікам вучоту зарплаты, ініцыятарам пераводзеньня тваёй брыгады на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну.

Дабіся хутчэйшага ўвядзеньня чатырохбрыгаднага графіку, гэта—біч абязьлічкі. Організуй пашпартызацыю варштатаў. Ты павінен выпускаць добраякасную продукцыю. Ніводнага процанту браку—твая задача.

Змагайся за стандарт, будзь ініцыятарам СО (соцыялістычнага абмену вопытам).

Памятай, што ад выкананьня гэтага маршруту залежыць выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Таму вызнач свае сустрэчныя абавязацельствы па заданьню, дадзенаму ячэйкай.

Мэханічная апрацоўка казловай скуры

### Маршрут V

## За дзяржпляны для варштату

Пры далейшым уздыме вытворчасьці працы пляннава-опэрацыйныя групы павінны быць ініцыятарамі вылучэньня сустрэчных прамфінпляна ў з боку рабочых.

(З пастановы ЦК УсеЛКСМ)

Выкананьне і перавыкананьне плянаў залежыць ад правільнага масавага плянаваньня ля варштата, у цэху, на прадпрыемстве, у рэспубліцы.

Організуй у сваёй брыгадзе плянава-опэрацыйную групу, уцягні ў яе рабочых асноўных кваліфікацый, сумесна з імі распрацуй зьменна-сустрэчны плян тваёй брыгады, улічы наяўнасьць сыравіны, высьветлі яе скарыстаньне, змагайся за мінімальнае выдаткаваньне сыравіны.

Плянава - опэрацыйную групу зьвяжы з плянавіком заводу, дабіся організацыі агульна-заводзкага плянава-опэрацыйнага кантролю.

Памятай, што ўдарнік першай пяцігодкі—плянавік другой, таму зараз-жа організуй вывучэньне і давядзеньне да кожнага варштата плянаў 4 заключнага і прапрацоўку плянаў другой бальшавіцкай пяцігодкі.

### Маршрут VI

## За соцыялістычны быт

Сёньнешні рабочы, наш савецкі рабочы хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных патрабаваньняў і ў сэнсе харчовага забясьпечаньня, і ў сэнсе забясьпечаньня культурным усякіх іншых запатрабаваньняў. (Сталін).

Організуй паход за чысты барак за чысты ложак, аб'яв вайну блыхам і клапам. Зрабі свой ложак прыкладным у гэтым напрамку, дабіся, каб кожны ўдзельнік тваёй брыгады прытрымліваўся сан мінімуму.

Ты павінен зьявіцца організатарам вытворча-бытавой комуны ў сваім цэху.

Ты павінен дапамагчы цэху прадпрыемства — сталоўцы наладзіць сваю працу, зьнішчыць чаргу у сталоўцы, магазыне і г. д. Рабочы павінен атрымаць абед на працягу 10-ці хвілін. Клюбная праца павінна задаволіць рабочага-ўдарніка.

Краіна, якая пасьпяхова будуе соцыялізм, павінна быць высока культурнай. Змагаючыся за палепшаньне культбытавых умоў, ты практычна рэалізуеш лёзунг нашай партыі—„за культурную рэволюцыю“

## Ты выканаў Сталінскую пуцёўку?

### Гэты графік павінен быць запоўнены кожным комсамольцам на працягу 4-га кварталу 3-га рашаючага году 5-цігодкі

| Ячэйка даручае правесьці па маршруту наступную работу | Твой сустрэчны | Тэрмін выкананьня | | Рэальныя вынікі ад ажыцьцяўленьня дадзенага табе заданьня | Адзнакі сэкратара ячэйкі аб выкананьні заданьняў па маршруту |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Тэрмін, які дае ячэйка | Твой сустрэчны | | |
| | | | | | |

## Барацьба за шматмільённы ня скончана

### Задаволеныя прадмюдаўскімі посьпехамі Менск і Віцебск „пачываюць на лаўрах“

### ТЭМПЫ НЯУТРЫМАНЫ

Віцебская комсамольская організацыя напярэдадні МЮДу дабілася вялізарных посьпехаў у барацьбе за шматмільённы комсамол. Каля 400 чалавек рабочай моладзі—вось лічба прадмюдаўскага набору.

Аднак, гарадзкая організацыя не змагла ўтрымаць тэмпы росту і ганебна іх пасьля МЮДу здала. Большасьць комсамольскіх колектываў „пачывае на лаўрах“ і ніякай барацьбы за шматмільённы комсамол не праводзіць. Так, колектыў цягі МББ за цэлы месяц пасьля МЮДу вырас толькі на 6 чалавек, пры значнай базе рабочай моладзі на чыгунцы.

На фанерным заводзе з 300 чалавек рабочай моладзі ў комсамоле толькі 80. Новае кіраўніцтва комсамольскага колектыву працягвае палітыку стаўкі на самацёк у росьце.

Фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі“, якая вырасла к МЮДу да 1400 комсамольцаў, зусім аслабіла работу па росту. Каля 50 проц. рабочай моладзі фабрыкі па-за комсамолам. За месяц вырасьлі толькі на 24 чалавекі. Ганебныя тэмпы росту паказвае камітэт панчошнай фабрыкі Клары Цэткін, дзе прынята пасьля МЮДу 20 ч. фабрыкі „Дзьвіна“—44, акулярнай—10, фабрыкі імя Лекерта—4. Відаць што кіраўніцтва буйнейшых камітэтаў і колектываў г. Віцебску зразумелі рост як кампанію.

Л. Босы

### Работа сярод навічкоў адсутнічае

За апошні час комсамольскі колектыў менскай абутковай фабрыкі прыняў у свае рады 60 чал. рабочай моладзі. Але трэба сказаць што сярод іх, як і сярод тых, якія прыняты да МЮД'у, ніякай работы не вядзецца.

На ўсе яшчэ ўцягнуты ва ўдарныя брыгады, не ахоплены соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Колектыў абмежаваўся толькі тым, што організаваў гурткі для навічкоў на 100 чал., але працуюць толькі 2 гурткі, якія наведваюць 25 чал.

А.

## Як рэалізаваць сталінскую пуцёўку?

Сёньня, 7-й гадзіне ўвечары у памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі (Комсамольская. 25) ЦК ЛКСМБ, „Чырвоная Зьмена“, гарком ЛКСМБ і ЦСПСБ склікаюць шырокую нараду прадстаўнікоў ЦК ЛКСМБ і ЦП профсаюзаў, эканомпрацаўнікоў, комсамольскі актыў, прадстаўнікоў ЛКСМБ шматтыражак, юнкораў па пытаньню:

**практычнай рэалізацыі сталінскай пуцёўкі**

Яўка ўсіх таварышоў абавязкова.

ЦК ЛКСМБ, „Чырвоная Зьмена“, Гарком ЛКСМБ, ЦСПСБ.

12 кастрычніка, а 8 гадз. слухайце ўсесагульнае радыёапавяданьне, арганізаванае „Комсомольской Правдой“. Будуем Урала-Кузбас—сусьветны гігант чорной мэталюргіі Комсамолія Аршанскага чыгуначнага вузла раскажа аб сваім удзеле ў будаўніцтве Урала-Кузбасу.

Ударнікі 8-й комсамольскай ісгужкі „Сьцягу Індустрыялізацыі“, „Комунаркі“, бабруйскага з-ду імя Сталіна, комбінату імя „КІМ“. Асіпторпу і Могвалокнабуду раскажуць аб бальшавіцкіх рэкордах у барацьбе за будаўніцтва сацыялізму. Арганізоўвайце масавыя слуханьні, рыхтуйцеся да ўсесаюзнай радыёпераклічкі.

„Чырвоная Зьмена“,
Бел. аддзел „Камс. Правда“



# ПАСТАНОВА

## Колегіі Народнага Камісарыяту Земляробства БССР па пытаньні пароднага раёнаваньня жывёлагадоўлі

*Канец. Пачатак глядзі ў № 233 (1502)*

9. Прапанаваць Белмалакоколгасцэнтру ў 2-х дэкадны тэрмін вылучыць у адпаведнасьці з плянам пароднага раёнаваньня пад племгасы 20 колгасаў з якіх: па швіцкім быдле—10, па чырвона-беларускіх—6 і па колёнісцім—4 і падаць у Наркомзем на зацьверджаньне.

10. Давесьці зямельную тэрыторыю вылучаных саўгасаў для племработы ня менш як да 2-3 тысяч га з колькасьцю галоў племяннога гурту ня менш тысячы, з колгасаў ня менш 700-1000 га з колькасьцю галоў ня менш 300.

11. Прапанаваць саўгасам „Сьвінаводу“, Насентрэсту, і Галоўленкому ў 2-х месячны тэрмін перадаць у парадку абмену ўсю плем-плянавую пароду буйнай рагатай жывёлы Малочна-Масьлянаму Трэсту і Белсельтрэсту.

12. Прапанаваць усім Саўгастрэстам плян перакідкі племжывёлы ўзгадніць з Сэктарам Вэтэрынарыі і жывёлагадоўлі.

13 Прапанаваць Белсельтрэсту і Малочна-Масьлянаму трэсту:

а) у 2-х месячны тэрмін перакінуць усю племянную плянавую жывёлу з саўсасаў у племгасы.

б) прадугледзець у кантрольных лічбах на 1931 г. поўны аб'ем будаўніцтва, комплектаваньня організацыі кармовай базы і мэханізацыю ў вылучаных племгасах.

14. Прапанаваць Белсельтрэсту:

а) У трохмесячны тэрмін перакінуць няплянавыя чырвона-нямецкую і ангельскую пароды з зоны адведзенай для швіцкай пароды ў паўднёвую частку зоны, адведзенай для чырвона-беларускай пароды.

б) У месячны тэрмін утварыць элучэньне племгасаў Самуэлева Калінін і Прылукі, згодна § 8 гэтай пастановы.

15. Прапанаваць Горацкай Зональнай Станцыі:

а) у 2-х месячны тэрмін прадставіць у НКЗБ схэму мэтысацыі чырвона-беларускага і ангельскага быдла з дацкім быдлам.

б) распачаць сэлекцыйную працу ва ўсіх племгасах,

в) у 2-х месячны тэрмін выпрацаваць стандарт па чырвона-беларускім, швіцкім і колёнісцкім быдле.

16. Прапанаваць сэктару жывёлагадоўлі:

а) выпрацаваць інструкцыю аб перадачы племянной жывёлы з другіх саўгасаў у племгасы Белсельтрэсту і Малочна-Масьлянага трэсту.

б) Пасьпешна арганізаваць Дзяржплемкнігі па чырвона-беларускім, швіцкім і колёнісцкім белагаловым быдле, угадніўшы гэта пытаньне з НКЗ БССР.

### б) па конях

1. Устанавіць у якасьці паляпшаючай пароды па тэрыторыі БССР рысіста-арлоўскую, арлова-амэрыканскую і бэльгійскую цяжкавозную.

2. Масавую працу па палепшаньню мясцовага каня рысіста-арлоўскай пародай разгарнуць у наступных раёнах:

Бягомльскі, Плешчаніцкі, Лагойскі, Барысаўскі, Смалявіцкі, Талочынскі, Крупскі, Аршанскі, Дубровенскі, Горацкі, Шклоўскі, Мсьціслаўскі, Быхаўскі, Чавускі, Мсьціслаўскі, Крычаўскі, Цэрахаўскі, Клімавіцкі, Касьцюковіцкі, Чырвонапольскі, Быхаўскі, Прапойскі, Чэрыкаўскі Клічаўскі, Бярэзінскі, Чэрвеньскі, Карменскі, Рагачоўскі, Чачэрскі, Жлобінскі, Парыцкі, Буда-Кашалёўскі, Уваравіцкі, Веткаўскі, Гомельскі, Рэчыцкі Лоеўскі, Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Мазырскі, Хойніцкі, Каралінскі, Нараўлянскі, Брагінскі, Камарынскі, Лельчыцкі, Тураўскі.

3. Масавую працу па палепшаньню мясцовага каня арлова-амэрыканскай пародай разгарнуць у наступных раёнах:

Асьвейскі. Дрысенскі, Расонскі, Полацкі. Сірошінскі, Сураскі, Віцебскі, Лёзьненскі, Чашніцкі Сеньненскі, Бешанковіцкі, Лепельскі.

4. Масавую работу па палепшаньню мясцовага каня бэльгійскай цяжкавознай пародай разгарнуць у наступных раёнах:

Заслаўскі, Менскі, Койданаўскі, Пухавіцкі, Вузьдзенскі, Асіповіцкі, Капыльскі, Слуцкі, Стара-Дарожскі, Глускі, Бабруйскі, Любанскі, Старобінскі.

У мэтах вывядзеньня элітнага конскага стада арганізаваць канаплемгасы з рысіста-арлоўскім напрамкам у саўгасе Навасёлкі, Шарсцін, Веткаўскага раёну на 200 матак, з арлова-амэрыканскім напрамкам намесьціць у саўгасе Адаменкі, Лёзьненскага раёну на 100 матак, прычым канчатковае рашэньне аб перадачы саўгасу Адаменкі пад канаплемгас прыняць на пасяджаньні Колегіі з удзелам раённых організацый, а з бэльгійска-цяжкавозным напрамкам у Бабруйскім раёне на 100 матак, адвёўшы для гэтай мэты зямельную тэрыторыю ў працягу месячнага тэрміну.

6. Абавязаць Конгасцэнтр організаваць у адпаведнасьці з пародным раёнаваньнем колектыўныя гаспадаркі коняводнага напрамку ў колькасьці 20, з разьлікам ня менш 50 матак ца гаспадарку, з іх: арлова-амэрыканскім напрамкам 5, чыста-арлоўскім 10, і бэльгійска-цяжкавозным 5.

Адбор праводзіць у працягу месячнага тэрміну.

### в) па сьвіньнях

1. Устанавіць асноўнай паляпшаючай пародай па ўсёй тэрыторыі БССР белую буйную ангельскую пароду сьвіней.

2. Лічыць неабходным элітнае стада белай ангельскай пароды сьвіней сконцэнтраваць у саўгасе „Блонь“ і ў гаспадарцы Сьвінагадоўчага Інстытуту.

3. Племяннае стада сьвіней сконцэнтраваць у саўгасах „Твань“, „Райцы“ і „Ціманава“ таксама вылучыць адзін саўгас у быўшай Гомельскай акрузе і адзін у быўшай Магілеўскай.

Матачнае стада да канца 1931 г. у племяных гаспадарках разам з элітным стадам давесьці да 2500 галоў.

Белканторы „Сьвінаводу“ не пазьней 20 ліпеня вылучыць саўгасы ў паказаных акругах, безадкладна разгарнуўшы у іх будаўніцтва і фармаваньне матачнага стада.

4. Абавязаць Белсьвінаводколгасцэнтр у працягу 2-х дэкаднага тэрміну вылучыць 25 сьвінагадоўчых колгасаў пад племгасы. Матачнае стада гэтых колгасаў-племгасаў вызначыць ня менш як у 100 матак на гаспадарку.

5. Абавязаць Белкантору „Сьвінаводу“ і аддзяленьне Белсьвінаводколгасцэнтру правесьці адбор лепшага стада мясцовых сьвіней і сконцэнтраваць іх па лініі саўгасаў ў 1—2 саўгасах, а па лініі колгасаў у 10—12 колгасах, даручыўшы Сьвінагадоўчаму інстытуту разгарнуць у сьвінагадоўчых гаспадарках кантрольную працу над мясцовай сьвіньнёй.

### г) па птушках

1. Устанавіць у якасьці паляпшаючай пароды птушак на тэрыторыі БССР па курах Род-Айлэнд і Віандот па качках—Пэкінскія і індэйскія бегуны, па гусях—Халмагорскія і Эндэмскія і па індыкох—мясцовыя.

2. Лічыць неабходным прамысловае птушкаводзтва у адпаведнасьці з вызначанымі пародамі праводзіць у наступных раёнах:

#### а) па качках і гусях

Прамысловае птушкаводзтва па воднай птушцы (качках і гусях) разьвіваць па ўсёй тэрыторыі БССР у залежнасьці ад наяўнасьці вадазбору.

#### па курах пароды „Віандот“

Чачэрскі, Буда-Кашалёўскі, Уваравіцкі, Веткаўскі. Гомельскі, Цэрахаўскі Рэчыцкі. Лоеўскі, Брагінскі, Камарынскі, Нараўлянскі, Хойніцкі.

#### в) па курах пароды „Род-Айланд“

Аршанскі, Горацкі, Дубровенскі, Крупскі, Мсьціслаўскі, Талочынскі, Асіповіцкі, Бабруйскі, Глускі, Жлобінскі Клічаўскі, Любанскі, Парыцкі, Рагачэўскі, Слуцкі Старадарожскі. Старобінскі, Чырвона-Слабодзкі, Бешанковіцкі Віцебскі, Гарадоцкі „Лёзьненскі, Сіроцінскі, Сураскі, Сеньненскі, Чашніцкі, Быхаўскі, Бялыніцкі, Кармянскі, Касьцюковіцкі, Клімавіцкі, Чырвонапольскі. Крычаўскі, Магілеўскі, Прапойскі, Чавускі, Чэрыкаўскі, Шклоўскі, Жыткавіцкі, Мазырскі, Каралінскі, Лельчыцкі, Петрыкаўскі, Тураўскі, Менскі, Барысаўскі, Бягомльскі, Бярэзінскі, Заслаўскі, Копыльскі, Койданаўскі, Лагойскі, Плешчаніцкі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Вузьдзенскі, Чэрвеньскі, Асьвейскі, Вушацкі. Дрысенскі, Полацкі, Расонскі Лепельскі.

3. Вылучыць для правядзеньня племпрацы па птушкаводзтву наступныя гаспадаркі: па качках саўгас „Вымна“ Сураскага раёну, па гусях саўгас „Беразьнеўка“, Гарадоцкага раёну, па курах „Род-Айлэнд“ саўгас „Сеньніца“ і Жлобінскі Комбінат. па „Віандоту“ саўгас „Любны-Пяскі“, Гомельскага раёну.

4. Разьмер матачнага ядра кожнага племгасу павінен быць ня менш 5000 галоў.

Прапанаваць сэктару Жывёлагадоўлі падаць у колегію НКЗБ меркаваньні адносна работы з індыкамі.

#### д) па трусох

1. Устанавіць на тэрыторыі БССР асноўнай пародай трусоў для масавага палепшаньня мясцовых трусоў пароды „Шаншыль“ і „Белы Велікан“.

2. Лічыць неабходным вылучыць прамыслова-племяныя гаспадаркі з трусамі ў наступных саўгасах: „Дзягелева“, Віцебскага раёну, „Пракопаўка“ Цэрахаўскага раёну.

#### е) па авечках

1. У мэтах палепшаньня мясцовай грубашэрстнай авечкі ў кірунку мяса шэрстнай пароды накінуць у БССР як палепшаныя тры пароды авечак: „Усходне-Прускую“, Лінкольскую і „Окс-ордшырдаўскую“.

2. Лічыць неабходным усіх авец племяных парод, якія былі завезены ў БССР у працягу мінулых гадоў і якія знаходзяцца ў гаспадарках розных сыстэм, перадаць БК Цэнтру. Апошняму ў месячны тэрмін выбраць для гэтай мэты адпаведныя колгасы.

3. Усю работу па палепшаньню авец сконцэнтраваць у колгаснай сыстэме.

1. У адпаведнасьці з вылучанымі раёнамі для організацыі племгасаў прапанаваць Райза і Земляўпарадкаўчаму сэктару НКЗему ў месячны тэрмін правесьці земляўпарадкаваньне ўсіх племгасаў і адвод новых.

2. Даручыць сэктару Жывёлагадоўлі:

а) Распрацаваць палажэньне аб племяных саўгасах і колгасах.

б) Устанавіць цэны на племжывёлу

в) Устанавіць структуру племпрацы

Распрацаваць кантрольныя лічбы па племжывёле на 1932-33 г.

д) Устанавіць апорныя пункты для навукова-дасьледчай працы па ўсіх галінах жывёлагадоўлі.

3. Прапанаваць Райза скончыць у ліпені месяцы вучот племжывёлы.

4. Абавязаць сэктар кадраў забясьпечыць ўсе племяныя гаспадаркі зоатэхнічным і вэтэрынарным пэрсаналам як шляхам перакідкі маючыхся кадраў, так і бліжэйшых выпускаў ВНУ і тэхнікумаў.

Нам. наркомземляробства Масюкоў

---

Рыхтуемся да зімоўкі жывёлы

# Ацяпленьне абор і сьвінарнікаў—у парадак дня

## Комсамольскія ячэйкі! Організоўвайце суботнікі па ацяпленьню хлявоў і сьвінарнікаў

## Дамо цёплае, сьветлае і сухое памяшканьне жывёле

У дадзены, рашаючы год пяцігодкі, уся наша грамадзкасьць мобілізуецца на поўную ўтылізацыю ўсякай сыравіны, якая толькі можа паслужыць кармовым запасам.

Багатыя кармовыя запасы дадуць нам магчымасьць узьняць на патрэбную вышыню продукцыйнасьць нашай мяса-малочнай гаспадаркі, якая хутка расьце ў сваіх памерах.

Своечасова будзе ўспомніць, з другога боку, аб падрыхтоўцы для жывёлы к зіме ўпаўне цёплых і задавальняючых патрэбам гігіены хлявоў і абор.

У гэтым выпадку мы павінны, як і заўсёды сумленна і адкрыта, прызнаць свае недахопы. Летась у гэтых адносінах далёка няўсё было добра Рад колгасаў і нават саўгасаў трымаў жывёлу ў хлявох са шчылінамі, з неацепленай страхою, непрыстасаванымі варотамі. Здаралася, што ў хлявох нехапала сьцен, жывёла зімавала проста пад паветкай (колгас „Таварыш“, колгас „Шляхі колектывізацыі“ Горацкага раёну і г. д.).

Пры такой зімоўцы выдаткоўваецца шмат лішняга корму, для зьбіраньня якога мы зараз напружваем усе сілы, а ўдой паніжаецца. Пры такіх абставінах мала карысьці прынясуць і нашы кармовыя запасы.

Дагэтуль мы заўжды спазьняліся з падрыхтоўкай для жывёлы хлявоў на зіму. Пачыналі аб гэтым думаць тады, як надыходзіла калі не зіма дык позьняя восень Насьпех канапаціліся шчыліны саломай ці сенам, і на гэтым канчалася ўсё ацяпленьне. Сена і салому жывёла хутка зьвыгвала са сьпен і ўсе сьляды нашых клопатаў зьнішчаліся.

Бязумоўна, калі справа будзе ісьці аб часовым прыстасаваньні пад зімоўку старых хлявоў, то галоўным матар'ялам для ацяпленьня павінна стаць гліна, якою трэба акуратна, добрасумленна, абмазаць сьценкі як з надворнага боку, так, па магчымасьці, і знутры.

Такім спосабам любы хлеў можа быць ператвораны у зусім цёплае і



Да сустрэчы зімы будзем гатовы!

здавальняючае памяшканьне, абы былі якія небудзь сьценкі, каб прыляпіць гліняную абмазку.

Зразумела, што добрая абмазка магчыма толькі ў цёплае надвор'е калі ёсьць яшчэ час добра прасохнуць да зімы.

Вось чаму трэба лічыць, што раз мы ня прыступім да гэтай работы зараз жа, дык упусьцім час і ня выканаем сваіх абавязацельстваў па ўсямэрнаму садзейнічаньню ўзьняцьцю нашай жывёлагадоўлі.

Час не чакае, У бліжэйшыя дні ва ўсіх колгасах і саўгасах павінны быць складзены спэцыяльныя брыгады па падрыхтоўцы на зіму хлявоў для жывёлы.

Брыгадзір нясе поўную адказнасьць за тое, каб да зімы для ўсёй жывёлы было гатова цёпла і сьветлае памяшканьне.

Бязумоўна, у гэтай рабоце павінен быць зацікаўлены ўвесь актыў работнікаў гаспадаркі, і у першую чаргу нашы маладыя сілы—наш комсамол, які заўсёды і ва ўсякай будове павінен быць наперадзе

На гэты фронт рамонту і прыстасаваньня старога трэба ўдзяляць ня менш увагі, чым на пабудовах новых добрых хлявоў.

Сьвядомы ўдзельнік будаўніцтва павінен разумець, што далейшая хуткасьць пабудовы будзе залежаць ад нашых магчымасьцяй, а гэтыя магчымасьці зьнізяцца тым у большай меры, чым большая частка жывёлы чакаючы новых будынкаў, будзе мерзнуць у неацепленых старых хлявох.

Пры такой зімоўцы жывёла ня дасьць патрэбнай продукцыі, а гэта зьменшыць і нашы магчымасьці ў далейшым размаху будаўніцтва.

Зараз уся ўвага і сілы павінны быць адданы на падрыхтоўку да зімы, каб зноў ня было вельмі позна так,—за стварэньне брыгад па падрыхтоўцы хлявоў на зіму.

За цьвёрды і жорсткі наказ гэтым брыгадам: ня спыняцца на паўмерах і стварыць зусім здавальняючую зімоўку для ўсяе жывёлы, не шкадуючы на гэта ні сіл ні часу.

Кастрычнік—месяц падрыхтоўкі да зімоўкі жывёлы. Дамо ёй цёплае сьветлае, сухое памяшканьне.

Клемэнчыч

Горкі Зональная станцыя малочнай гаспадаркі

---

**8-га** кастрычніка г. г., а 7-й гадз. увеч., у памяшканьні ЦКК РСІ (Савецкая, 55, 1-шы паверх, Бюро Скаргаў) склікаецца зьлёт груп „ЛК“. З прычыны важнасьці пытаньня, яўка абавязкова.

Штаб ЛК гаркому ЛКСМБ.

9-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому-Навукі і Тэхнікі (Комсамольская, 25) адбудзецца нарада па пытаньню аб

## стане ФЗВ

На нараду павінны зьявіцца: Сэкратары і члены бюро колектываў і ячэек ЛКСМБ ФЗВ, члены цэхкомаў ФЗВ, загадчыкі, намесьнікі і настаўнікі (комсамольцы і комуністыя).

Менгарком ЛКСМБ.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599.